# ARCHE



Паўстаньне 1863—1864 гг. і лёсы Беларусі

ARCHE 12 (99)
сьнежань 2010

ARCHE 12-2010

**Навуковы, навукова-папулярны, грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «ARCHE Пачатак» выдаецца зь верасьня 1998 году штомесяц.**

## РЭДАКЦЫЯ:

**Валер Булгакаў** — галоўны рэдактар
**Аляксандар Пашкевіч** — намесьнік галоўнага рэдактара
**Віктар Жыбуль** — рэдактар
**Алена Казлова** — сакратарка рэдакцыі
**Аляксандра Макавік** — рэдактар
**Сяргей Бахун** — распаўсюднік

Укладаньне нумару — **Вольга Гарбачова**

**ARCHE is a Partner of European Cultural Journals Network Eurozine (www.eurozine.com)**

**Адрас для допісаў:** ARCHE, а/с 3, 220018, Менск-18.
**E-mail:** arche@arche.org.by.
**Тэл.** (029) 550-79-69.

Часопіс можна замовіць у распаўсюднікаў:

**Баранавічы** — Руслан Равяка, п/с 13, 225409, Баранавічы-9, тэл. (029) 767-20-37.

**Берасьце** — Ігар Бараноўскі, тэл. (0162) 25-61-55, (029) 8-000-157.

**Віцебск** — Барыс Хамайда, тэл. (0212) 34-52-41.

**Гародня** — Эдвард Дмухоўскі, тэл. (029) 133-87-17.

**Гомель** — Ларыса Шчыракова, тэл. (029) 341-66-94; Дзяніс Федарэнка, тэл. (029) 733-55-22.

**Магілёў** — Алесь Асіпцоў, тэл. (0222) 25-57-85, (029) 625-57-85.

**Маладэчна** — Алесь Кштальтны, тэл. (044) 792-36-88, (033) 602-19-74.

**Менск** — Сяргей Бахун, тэл. (029) 724-54-56, 624-54-56.

**Наваполацак** — Ірына Бельская, тэл. (029) 296-15-73.

Шукаем распаўсюднікаў зь іншых мясьцінаў.

**Падпіска на часопіс «ARCHE Пачатак» прымаецца ўва ўсіх аддзяленьнях «Белпошты».**

**Заснавальнік:** Андрэй Дынько.
**Выдавец:** установа «Рэдакцыя часопісу «Архэ-Пачатак».
Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 530 ад 4.05.2001.
ISSN 1392-9682

**Юрыдычны адрас:** вул. Нававіленская, 24/1А, каб. 2П, 220053, Менск.
Цана дамоўная.
Рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе рукапісаў.
Рэдакцыя рэдагуе матэрыялы, прынятыя да друку.

Падпісана ў друк 27.12.2010.
Выхад у сьвет 30.12.2010. Фармат 70x100 1/16.
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная.
Наклад 600 асобнікаў. Замова

Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка ў друкарні ТАА «Палікрафт», вул. Кнорына, 50, 220103, Менск.
ЛП № 02330/0131696 ад 30.04.2004.

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаныя фотаздымкі ўдзельнікаў паўстаньня 1863—1864 гг. з фондаў Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіву і Польскай бібліятэкі ў Парыжы.
Дызайн вокладкі — Ягор Шумскі.

© «ARCHE Пачатак», 2010

**Падпісны індэкс 00345**

**ARCHE on-line:** http://arche.by

ARCHE

12-2010

## ЗЬМЕСТ

5 **ВОЛЬГА ГАРБАЧОВА**. У барацьбе за правы і незалежнасьць

**ПАДЗЕІ І ЎДЗЕЛЬНІКІ**

8 **АЛЕНА ФІЛАТАВА** Ідэя дзяржаўнасьці на беларуска-літоўскіх землях у 1861—1864 гг.
15 **АЛЯКСАНДАР РАДЗЮК** «Мары» Ігната Арамовіча
18 **ІГНАТ АРАМОВІЧ** Мары. Успаміны аб партызанскім руху ў Гарадзенскім ваяводзтве ў 1863 і 1864 гг.
72 **АНДРЭЙ КІШТЫМАЎ** Першая рэйкавая вайна
86 **ЯН ТРЫНКОЎСКІ** Паўстанец 1863 году Антоні Санкевіч
95 **ЗІНАІДА АНТАНОВІЧ** У барацьбе за веру
99 **ВОЛЬГА ГАРБАЧОВА** Паўстанцы 1863 году на фотаздымках

**РЭПРЭСІІ І ПЕРАСЬЛЕД**

133 **АЛЯКСАНДАР РАДЗЮК** Рэпрэсіўная палітыка царызму на землях Беларусі ў 1863—1864 гг.
151 **АЛЯКСАНДАР РАДЗЮК** Зьнішчэньне шляхецкіх ваколіцаў на Гарадзеншчыне ў 1863—1864 гг.
174 **АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК** Гарадзенскія «мяцежнікі»
186 **ЗІНАІДА АНТАНОВІЧ, ВОЛЬГА ГАРБАЧОВА** Паўстаньне 1863—1864 гг. у лёсе рымска-каталіцкага сьвятарства Беларусі
203 **ВАЛЯНЦІНА ШАЎКАПЛЯС** Палітычны рэжым у Беларусі ў 60-я гг. XIX ст.
211 **ЛІЛІЯ КОЎКЕЛЬ** Канфіскацыя прыватных кніжных калекцыяў на беларускіх землях пасьля паўстаньня 1863 г.
222 **АЛЕНА СЕРАК** Працэс этапаваньня паўстанцаў 1863—1864 гг. у Сібір
237 **ВЯЧАСЛАЎ ПАЎЛАЎ** Паўстанцы з тэрыторыі Беларусі на пасяленьні ў Казанскай губэрні

258 **СЬВЯТЛАНА МУЛІНА** Удзельнікі паўстаньня 1863 году з Заходняга краю ў заходнесібірскай ссылцы

## ГІСТАРЫЧНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

269 **ВАЛЯНЦІНА ЯНОЎСКАЯ** Хрысьціянскае духавенства Беларусі ў паўстаньні 1863—1864 гг.: гістарыяграфія праблемы

284 **АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА** Сувораў супраць Мураўёва

## РЭЦЭНЗІЯ

300 **АНДРЭЙ КІШТЫМАЎ** Новыя крыжаносцы

АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК

# Гарадзенскія «мяцежнікі»

Французскі гісторык Марк Блок калісьці трапна ахарактарызаваў гісторыю як навуку пра чалавека ў часе. На жаль, айчынная гістарыяграфія збольшага ігнаравала гэтага самага чалавека. Асноўная ўвага ў нас традыцыйна надавалася палітычным, эканамічным, культурным і канфесійным падзеям, у якіх часцяком дамінаваў пэўны ідэалагічны канструкт ці сацыяльная функцыя (сацыяліст, памешчык, рэвалюцыянер, асветнік і г. д.). Зразумела, што пры гэтым нашае веданне мінулага звужалася і пераставала быць сапраўды гістарычным…

Такім самым аказаўся і лёс паўстання 1863 г. у айчыннай гістарычнай навуцы. Сёння мы ведаем з дзясятак імёнаў ягоных правадыроў на чале з славутым Кастусём Каліноўскім, і гэтае веданне праецыруем на ўсё паўстанне ды ўсіх ягоных удзельнікаў. Між тым нават К. Каліноўскі ў многіх даследаваннях выглядае хутчэй сімвалам сучаснай беларускасці, чым чалавекам сярэдзіны XIX ст.

Кім жа былі тыя, хто адгукнуўся на заклік Каліноўскага і ягоных паплечнікаў ды пайшоў у паўстанцкія атрады, каб змагацца за волю, здабываючы лепшую долю свайму краю і свайму народу?

Убачыць гэтых людзей дазваляюць беларускія архіўныя зборы. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне захаваліся матэрыялы Гарадзенскай ваенна-следчай камісіі. Сярод іх — і спіс мясцовых «мяцежнікаў», якія знаходзіліся пад следствам у перыяд з 10 лютага па 1 верасня 1863 г. і былі зняволеныя ў гарадзенскім турэмным замку. Спіс публікуецца ніжэй у форме табліцы ў перакладзе на беларускую мову.

Звесткі, атрыманыя з гэтага спіса, дазваляюць зрабіць пэўныя высновы адносна характару паўстання на Гарадзеншчыне. У прыватнасці, сярод тых, хто быў прыцягнуты Гарадзенскай ваенна-следчай камісіяй да адказнасці, можна адзначыць адносна высокую долю сялянства (22,3 %). Відавочна, што сяляне

**Алесь Смалянчук** — гісторык, доктар гістарычных навук. Прафэсар Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, дырэктар Інстытуту гістарычных дасьледаваньняў Беларусі пры ЭГУ, рэдактар гадавіка антрапалягічнай гісторыі «Homo Historicus». Аўтар манаграфіі «Паміж краёвасьцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864—1917» (Санкт-Пецярбург, 2004). Неаднаразова друкаваўся ў «ARCHE», апошняя публікацыя — рэцэнзія «Дыскусія пра вытокі на фоне "ідэалягічнай рэвалюцыі"» (3/2008).



pawet.net

Гарадзеншчыны ў параўнанні з сялянствам іншых рэгіёнаў Беларусі і Літвы (ды нават і Польшчы!) больш актыўна падтрымалі паўстанне. Магчыма, да гэтага прычынілася агітацыя «Мужыцкай праўды», а таксама тэрытарыяльная блізкасць ахопленага паўстаннем Каралеўства Польскага.

Галоўнай сілай паўстання і тут была шляхта (цікава, што пісары Ваенна-следчай камісіі адрознівалі «дваранаў» ад «шляхціцаў»). Прадстаўнікі гэтага саслоўя складалі сярод арыштаваных 48,6 %. Пры гэтым сярод «мяцежнікаў» аказалася 13 прадстаўнікоў мясцовага чынавенства — ад калежскага асэсара да надворнага радцы (!). Мяшчане складалі 7,4 %, а духавенства было прадстаўлена толькі двума каталіцкімі ксяндзамі.

Геаграфія «мяцежнікаў» была даволі шырокай, але выразна дамінавалі Горадня (41) і Гарадзенскі павет (11). З іншых паветаў найбольш бунтарскімі аказаліся Беластоцкі павет у Гарадзенскай губерні і Лідскі павет у Віленскай губерні.

Самай значнай падзеяй паўстання ў Горадні стала спроба захопу цягніка групай «мяцежнікаў» на чале з начальнікам чыгуначнай станцыі Кульчыцкім 2 сакавіка 1863 г. На станцыі адбыўся бой. Частка групы здолела пакінуць Горадню, але большасць апынулася ў турэмным замку. У спісе фігуруюць 42 удзельнікі «хваляванняў» 2 сакавіка. Сярод іх было шмат вельмі маладых людзей. У прыватнасці, гэта гімназісты (усіх 14) разам з настаўнікам гімназіі Станіславам Навакоўскім. Дарэчы, паводле спіса, малодшаму ўдзельніку паўстання было 15 гадоў, а старэйшаму — 75. Сярэдні ўзрост арыштаваных быў каля 32 гадоў.

Найбольш вядомым «ваенным злачынцам» са спісу арыштаваных быў адстаўны штабс-капітан Станіслаў Завістоўскі, які камандаваў паўстанцкім атрадам. Ён быў дастаўлены ў гарадзенскую турму 18 чэрвеня. У той жа дзень (!) ягоную справу прадставілі вайсковаму губернатару. Канчаткова лёс С. Завістоўскага вызначыў камандуючы войскамі Віленскай вайсковай акругі. 10 ліпеня 1863 г. паўстанец быў расстраляны ў Ваўкавыску[1].

Не ўсе арыштаваныя здолелі з годнасцю вытрымаць выпрабаванні лёсу і ўмовы зняволення. Удзельнікі «хваляванняў» 2 сакавіка на гарадзенскай чыгунцы Адольф Кашуба (16 гадоў) і Юзаф Гамуліцкі (18 гадоў) далі паказанні, паводле якіх да адказнасці прыцягнулі 8 чалавек. Дарэчы, следства па іх справе цягнулася амаль два месяцы. Ягоныя матэрыялы камісія падала вайсковаму губернатару Горадні толькі 30 красавіка, у той час як тэрмін следства для большасці арыштаваных складаў 1—2 тыдні.

Месяцам найбольшых рэпрэсій стаў сакавік, калі 48 чалавек апынуліся пад следствам (для параўнання адзначым, што ў маі іх было толькі шасцёра). У ліпені з 29 арыштаваных 8 чалавек трапілі ў турму паводле даносу «немца Рашпіхлера» (так у тэксце). Наагул, большасць арыштаваных прымалі непасрэдны ўдзел у паўстанні, але каля 30 асобаў утрымліваліся ў зняволенні з фармулёўкай «паводле падазрэння».

[1] Rok 1863. Wyroki śmierci / Red. W. Studnicki. — Wilno, 1923. Электронная версія кнігі размешчана на сайце: http://arkushy.ru.

Таксама, неабходна адзначыць прысутнасць у гэтым спісе жанчын і дзяўчат, сярод якіх вылучаюцца постаці трох сясцёр: Схаластыкі, Леакадзіі і Камеліі Германовічуўнаў з пазначэннем «дочкі ўніяцкага святара». Гэта вельмі цікавая прыпіска, асабліва калі згадаць, што Уніяцкая царква была афіцыйна ліквідаваная расійскімі ўладамі яшчэ ў 1839 г.

Месцам зняволення «ваенных злачынцаў» стаў гарадзенскі турэмны замак, размешчаны ў будынку колішняга езуіцкага калегіума ў цэнтры Горадні. Ён не быў належным чынам падрыхтаваны да прыёму вялікай колькасці арыштантаў. Умовы ўтрымання зняволеных былі вельмі цяжкія. Даследчык гісторыі гарадзенскай турмы Вячаслаў Лісіцын адзначыў адсутнасць у памяшканні ў пачатку 60-х гг. XIX ст. каналізацыі і ацяплення. Таксама адсутнічалі або былі моцна пашкоджаныя драўляныя падлогі. Гэта стварала вялікія праблемы, тым больш што арыштаваным у справе паўстання былі забароненыя ўсе перадачы. Арыштанты не мелі магчымасці атрымліваць цёплае адзенне або харчы. У многіх камерах адсутнічала шкло ў вокнах, і адміністрацыя вырашала гэтую праблему з дапамогай дошак. У выніку ўзніклі вялікія праблемы з вентыляцыяй і чыстым паветрам. Сур’ёзнай праблемай таксама была вада. Турма не мела сваёй студні, і ваду дастаўлялі ў бочках з Нёмана. Яе якасць была вельмі кепская[2].

Вялікая колькасць арыштаваных у 1863 г. змусіла ўлады шукаць новыя турэмныя памяшканні. Яны паспрабавалі развязаць праблему, ператварыўшы ў турму гарадзенскі «Стары замак» XIV—XVI стст. Умовы ўтрымання зняволеных у гэтым замку таксама былі даволі цяжкія.

Спіс Гарадзенскай ваенна-следчай камісіі ўтрымлівае 148 прозвішчаў. Некаторыя з іх выклікаюць пэўныя сумненні ў дакладнасці напісання. Аднак ніякіх правак у тэкст спісу не ўносілася. Наагул, параўнанне почыркаў дазваляе сцвярджаць, што дакумент складалі прынамсі тры пісары.

Нягледзячы на верагодныя недакладнасці спісу, ён знаёміць нас з гарадзенскімі «мяцежнікамі», даносіць атмасферу паўстання, загнанага ў турэмныя казематы. Ён дапамагае ўбачыць Чалавека паўстання — таго, хто ў большасці даследаванняў ніколі не выходзіць з ценю Кастуся Каліноўскага, Валерыя Урублеўскага, Зыгмунта Серакоўскага ды іншых правадыроў. Гэта постаці «другога плану», якія неслі на сабе асноўны цяжар змагання і без якіх ні само паўстанне, ні ягоныя правадыры ніколі не сталі б гонарам беларускай гісторыі.

2 Лисицын В. За тюремной стеной. История гродненской тюрьмы. XIX — 1939 г. Гродно, 2003. С. 45—46, 153—155.

## Спіс асобаў, прыцягнутых да следства Гарадзенскай ваенна-следчай камісіяй з 10 лютага па 1 верасня 1863 г.[3]

| № | Імя, прозвішча | Узрост | Пасада, саслоўная прыналежнасць | Падстава для арышту, дата зняволення |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Антон Блажэеўскі | 28 | Калежскі сакратар, чыноўнік Гарадзенскага «приказа общественного призрения» | Падчасператрусу знайшлі «билеты с символическими знаками»; з 31 студзеня 1863 г. |
| 2 | Войцех Рачынскі | 18 | Сын чыноўніка Полацкай гарадской паліцыі | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі і падробцы пашпарта; з 10 лютага 1863 г. |
| 3 | Фадзей Гадлеўскі | — | Ксёндз-настаяцель Сакалянскай парафіі | Падазрэнне ў «подстрекательстве крестьян к мятежу»; з 10 лютага 1863 г. |
| 4 | Юзаф Клапатоўскі | 38 | Упраўляючы маёнткам графа Валовіча, дваранін Плоцкай губ. | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі, супрацьдзеянне рэкруцкаму набору і «нарушение покоя мирных жителей»; з 21 лютага 1863 г. |
| 5 | Войцех Якубельскі | 32 | Бургамістр мястэчка Сапоцкіна, дваранін Аўгустоўскай губ. | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі, супрацьдзеянне рэкруцкаму набору і «нарушение покоя мирных жителей»; з 21 лютага 1863 г. |
| 6 | Віктар Маеўскі | 46 | Мешчанін Аўгустоўскай губ. | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі, супрацьдзеянне рэкруцкаму набору і «нарушение покоя мирных жителей»; з 21 лютага 1863 г. |
| 7 | Антон Нядзвецкі | 51 | Дваранін Аўгустоўскай губ. | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі, супрацьдзеянне рэкруцкаму набору і «нарушение покоя мирных жителей»; з 21 лютага 1863 г. |
| 8 | Антон Грабоўскі | 18 | Дваранін Варшаўскай губ. | Падазрэнне ў кантактах з паўстанцамі, супрацьдзеянне рэкруцкаму набору і «нарушение покоя мирных жителей»; з 21 лютага 1863 г. |
| 9 | Юзаф Гамуліцкі | 18 | дваранін Гарадзенскай губ. | За намер 2 сакавіка выехаць з Горадні на цягніку дзеля далучэння да паўстанцаў пад камандаваннем загадчыка Гарадзенскай чыгуначнай станцыі Кульчыцкага; з 5 сакавіка 1863 г. |

[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне. Ф. 3, воп. 1, спр. 33, арк. 1 адв. — 22 адв.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10 | Іпаліт Зуброўскі | 55 | Памешчык Гарадзенскай губ. | За «подстрекательство Гомулицкого к участию в мятеже»; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 11 | Адольф Кашуба | 16 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 2 сакавіка 1863 г. |
| 12 | Восіп Кашуба | 18 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 2 сакавіка 1863 г. |
| 13 | Станіслаў Рамбіцкі | 17 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 2 сакавіка 1863 г. |
| 14 | Іван Казімірскі | 39 | Бухгалтар Гарадзенскай Палаты дзяржаўнай маёмасці | Падазрэнне ва ўдзеле ў «хваляваннях». Гамуліцкі бачыў за чытаннем брашураў «возмутительного содержания» |
| 15 | Антон Галконд | 21 | Чыноўнік Гарадзенскай Палаты дзяржаўнай маёмасці | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 2 сакавіка 1863 г. |
| 16 | Восіп Кандзінскі | 17 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 17 | Іван Жук | 19 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 18 | Юльян Пушкарэвіч | 20 | Сын краўца | Паводле паказанняў Кашубы, атрымліваў «Хорунгвь свободы»; з 21 сакавіка 1863 г. |
| 19 | Казімір Самулінскі | 21 | «Письмоводитель» міравога пасрэдніка Шаптыра | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 20 | Казімір Талочка | 26 | Чыноўнік Гарадзенскага дэпутацкага сходу | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка, «взят на месте происшествия, ранен штыком в правое плечо»; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 21 | Вікенці Жукоўскі | 18 | Сын адстаўнога салдата | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 22 | Адольф Шмідт | 28 | Аптэкар у Горадні | Удзел у паўстанні; з 20 сакавіка 1863 г. |
| 23 | Вільгельм Грабавецкі | 27 | «Письмоводитель» канторы Друскеніцкіх мінеральных водаў | За «подстрекательство Гомулицкого к участию в мятеже»; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 24 | Станіслаў Куроўскі | 19 | Ураджэнец Люблінскай губ. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 8 сакавіка 1863 г. |
| 25 | Фёдар Ружко | 32 | Прускі падданы, ахоўнік чыгункі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 26 | Казімір Крэвень | — | Селянін Сакольскага пав., рабочы чыгункі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 27 | Іван Філістовіч | 23 | Селянін Вілейскага пав., рабочы чыгункі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 28 | Іван Жмайловіч | 41 | Дваранін Кобрынскага пав. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 29 | Юльян Краскоўскі | 25 | Служачы пры чыгунцы, дваранін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 30 | Георгі Краскоўскі | 17 | Служачы пры чыгунцы, дваранін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 31 | Баляслаў Ізбіцкі | 34 | Калежскі рэгістратар, служачы Гарадзенскага губернскага праўлення | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка разам з Ю. Краскоўскім; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 32 | Антон Багатырэвіч | 17 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 33 | Аўгуст Шэршыновіч | 19 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 34 | Кліменці Ізбіцкі | 14 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 35 | Антон Квяткоўскі | 18 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 36 | Станіслаў Крэйбіх | 18 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 37 | Аляксандр Букраба | 20 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 38 | Антон Ржажнецкі | 18 | Былы вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 15 сакавіка 1863 г. |
| 39 | Станіслаў Шантыр | 23 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 16 сакавіка 1863 г. |
| 40 | Уладзімір Баршчыўскі | 20 | Вучань аптэкара | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка (паказанні Гамуліцкага); з 16 сакавіка 1863 г. |
| 41 | Юльян Баяроўскі | 29 | Чыноўнік Гарадзенскай грамадзянскай палаты | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка (паказанні Гамуліцкага); з 15 сакавіка 1863 г. |
| 42 | Антон Сямашка | 22 | Былы вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка (паказанні Гамуліцкага); з 5 сакавіка 1863 г. |
| 43 | Станіслаў Блашынскі | 23 | Друкар Гарадзенскага губернскага праўлення | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка (паказанні Гамуліцкага); з 15 сакавіка 1863 г. |
| 44 | Карл Янкоўскі | 30 | Друкар Гарадзенскага губернскага праўлення | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 45 | Адольф Шыдлоўскі | 20 | Чыноўнік Гарадзенскага губернскага праўлення | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 46 | Януары Гартунг | 18 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 47 | Восіп Высоцкі | 23 | Чыноўнік канцылярыі начальніка Гарадзенскай губ. | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 48 | Міхайла Высоцкі | 22 | Чыноўнік Гарадзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 49 | Генрых Далянскі | 22 | Былы студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта | За ўдзел у «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 50 | Станіслаў Навакоўскі | 28 | Настаўнік Гарадзенскай гімназіі | За «подговор» да паўстання; з 16 сакавіка 1863 г. |
| 51 | Уладзіслаў Пачэбут (Пачобут?) | 25 | Памешчык Ваўкавыскага пав. | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 52 | Адам Пржыбылка | 19 | Тэлеграфіст Гарадзенскага чыгуначнага вакзала | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 53 | Станіслаў Развадоўскі | 19 | Вучань аптэкара | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 54 | Іван Эйслер | 21 | Вучань аптэкара | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 55 | Любамір Ястржэмбскі | 32 | Служачы чыгункі | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 56 | Леан Ястржэмбскі | 17 | Служачы чыгункі | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 5 сакавіка 1863 г. |
| 57 | Адам Мазюн | 40 | Селянін Гарадзенскага пав. | За падбухторванне да паўстання сялян в. Парэчча; з 29 красавіка 1863 г. |
| 58 | Мацвей Мазюк | 42 | Селянін Гарадзенскага пав. | За падбухторванне да паўстання сялян в. Парэчча; з 29 красавіка 1863 г. |
| 59 | Каспер Залескі | 18 | Шляхціц Астраленскага пав. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 60 | Людвік Казлоўскі | 26 | Селянін Аўгустоўскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 61 | Сямён Круповіч | 51 | Аднадворац Лідскага пав. Віленскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 62 | Дамінік Тароніс | 51 | Селянін Лідскага пав. Віленскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 63 | Антон Бартгрыевіч | 30 | Селянін Лідскага пав. Віленскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 64 | Валяр’ян Лазавіцкі | 25 | Аднадворац Гарадзенскага пав. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 65 | Ян Вільберг | 18 | Селянін Лідскага пав. Віленскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 66 | Мацвей Адашкевіч | 44 | Селянін Гарадзенскага пав. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 67 | Восіп Зуброўскі | 25 | Селянін Гарадзенскага пав. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 68 | Канстанцін Талочка | 25 | Дваранін Гарадзенскай губ. | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 69 | Якаў Жукоўскі | 25 | Мешчанін Горадні | Узяты на месцы бою атрадамі палкоўнікаў Пенаржэўскага і Вернера; з 29 красавіка 1863 г. |
| 70 | Аляксандр Казлоўскі | 26 | Памешчык Гарадзенскай губ. | Па падазрэнні ў кантактах з паўстанцамі; з 14 мая 1863 г. |
| 71 | Станіслаў Зубалевіч | 23 | Мешчанін г. Ваўкавыска | Па падазрэнні ў кантактах з паўстанцамі; з 14 мая 1863 г. (пісар Казлоўскага) |
| 72 | Іван Грыцкевіч | 22 | Вольнаадпушчанік памешчыка Казлоўскага, ураджэнец Гарадзенскай губ. | Па падазрэнні ў кантактах з паўстанцамі; з 14 мая 1863 г. |
| 73 | Міхаіл Міхайлоўскі | 40 | Адстаўны вахмістр Украінскага ўланскага палка | Па падазрэнні ў кантактах з паўстанцамі; з 14 мая 1863 г. |
| 74 | Эрнест Ржаняніцкі | 48 | Дваранін Гарадзенскай губ. | Па падазрэнні ў кантактах з паўстанцамі; з 14 мая 1863 г. |
| 75 | Іван Ожэ | 17 | Вучань Гарадзенскай гімназіі | Па падазрэнні ва ўдзеле ў «хваляваннях» 2 сакавіка; з 16 мая 1863 г. |
| 76 | Канстанцін Касмоўскі | 42 | Калежскі асэсар, сакратар Гарадзенскага «Приказа общественного призрения» | Па падазрэнні ў зборы грошай «в пользу восстания»; з 10 чэрвеня 1863 г. |
| 77 | Восіп Хоміч | 42 | Надворны радца, «непременный член» Гарадзенскай будаўнічай камісіі | Па падазрэнні ў зборы грошай «в пользу восстания»; з 10 чэрвеня 1863 г. (прыпіска: «У турэмным замку не ўтрымліваўся») |
| 78 | Юзаф Стычынскі | 27 | Селянін Аўгустоўскага пав., ямшчык Сапоцкінскай станцыі | За перадачу ліста ў «шайку мятежников»; з 13 чэрвеня 1863 г. |
| 79 | Тэадаіла Калантаева | 50 | Удава адстаўнога капітана | За кантакты са Стычынскім; з 13 чэрвеня 1863 г. (прыпіска: «У турэмным замку не ўтрымлівалася») |
| 80 | Эдуард Мацэевіч | 23 | Дваранін Віленскай губ. | За кантакты са Стычынскім; з 13 чэрвеня 1863 г. |
| 81 | Аляксандр Эйсмант | - | Губернскі сакратар, «смотритель» Гарадзенскай гарадской бальніцы | За кантакты са Стычынскім; з 13 чэрвеня 1863 г. (прыпіска: «У турэмным замку не ўтрымліваўся») |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 82 | Рудольф Мантовіч | 55 | Памешчык Гарадзенскай губ. | За дастаўку паўстанцам харчавання; з 13 чэрвеня 1863 г. |
| 83 | Ян Лaговіч | 30 | Вольнадпушчанік Аўгустоўскай губ. (аканом Мантовіча) | За дастаўку паўстанцам харчавання; з 13 чэрвеня 1863 г. |
| 84 | Якаў Станкевіч | 32 | Аднадворац Ковенскага пав. | За падбухторванне да паўстання; з 15 чэрвеня 1863 г. |
| 85 | Іван Жмайловіч | 41 | Дваранін Ковенскага пав. | За знаходжанне ў «шайке мятежников»; з 18 чэрвеня 1863 г. |
| 86 | Станіслаў Завістоўскі | 46 | Адстаўны штабс-капітан | За камандаванне «шайкой мятежников»; з 18 чэрвеня 1863 г. |
| 87 | Пётр Скірмунт | 23 | «Вольный человек» Гарадзенскага пав. | Па падазрэнні ва ўдзеле ў паўстанні; з 26 чэрвеня 1863 г. |
| 88 | Міхаіл Талочка | 21 | Дваранін Гарадзенскага пав. | За знаходжанне ў «шайке»; з 29 чэрвеня 1863 г. |
| 89 | Людвік Акінчыц | 24 | Вольнапрактыкуючы лекар Ваўкавыскага пав. | За садзейнічанне паўстанню; з 25 чэрвеня 1863 г. |
| 90 | Міхаіл Юроўскі | 52 | Памешчык Гарадзенскага пав. | За садзейнічанне паўстанню; з 29 чэрвеня 1863 г. |
| 91 | Фелікс Вайнеўш | 44 | Ксёндз Гарадзенскага пав. | За падбухторванне да паўстання; з 3 ліпеня 1863 г. |
| 92 | Станіслаў Сянькоўскі | 49 | Мешчанін Гарадзенскага пав. | За садзейнічанне паўстанню; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 93 | Міхаіл Панятоўскі | 52 | Калежскі сакратар | За садзейнічанне паўстанню; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 94 | Генрых Панятоўскі | 15 | Сын М. Панятоўскага | За садзейнічанне паўстанню; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 95 | Іван Лунеўскі | 29 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 96 | Дзіяніс Касынскі | - | Дваранін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у паўстанні; з 19 ліпеня 1863 г. |
| 97 | Фадзей Арцішэк | - | Селянін Гарадзенскага пав. | За ўдзел у паўстанні; з 19 ліпеня 1863 г. |
| 98 | Вікенцій Асвецінскі | 35 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 99 | Дамінік Талінскі | 32 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 100 | Іосіф Гваздко | 35 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 101 | Іван Талінскі | 32 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 102 | Іосіф Казлоўскі | 30 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 103 | Аляксандр Станкевіч | 30 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 104 | Іван Гжыдко | 48 | Селянін Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 105 | Іван Рагоўскі | 33 | Шляхціц Гарадзенскай губ. | За ўдзел у павешанні лесніка Юсціновіча; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 106 | Ігнацы Палуяноўскі | 35 | Шляхціц Гарадзенскай губ. | За знаходжанне ў «шайке»; з 25 ліпеня 1863 г. |
| 107 | Эдуард Гінтаўт | 32 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За пакушэнне на жыццё селяніна Рабічкі, кантакты з паўстанцамі; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 108 | Вільгельм Гумель | 37 | Жыхар мястэчка Супрасля | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 109 | Ян Вільчыкевіч | 45 | Дваранін Гарадзенскай губ. | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 110 | Міхаіл Айзілевіч | 49 | Селянін Беластоцкага пав. Гарадзенскай губ. | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 111 | Адам Маленда | 50 | Селянін Беластоцкага пав. Гарадзенскай губ. | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 112 | Міхаіл Іопшаль | 39 | Мешчанін г. Беластока | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 113 | Антон Лавіцкі | 45 | Дваранін Гарадзенскай губ. | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 114 | Вільгельм Лангейм | 28 | Падданы Прусіі | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 115 | Міхаіл Рыбакевіч | 23 | Мешчанін Беластоцкага пав. | Абвінавачаны ў кантактах з паўстанцамі паводле паказанняў немца Рашпіхлера; з 29 ліпеня 1863 г. |
| 116 | Канстанцін Пякарскі | 22 | Мешчанін г. Беластока | За знаходжанне ў «шайке»; з 26 ліпеня 1863 г. |
| 117 | Іван Дзяконскі | 24 | Дваранін Бельскага пав. | За знаходжанне ў «шайке»; з 3 жніўня 1863 г. |
| 118 | Вікенцій Пісанко | 19 | Аднадворац Беластоцкага пав. | За знаходжанне ў «шайке»; з 3 жніўня 1863 г. |
| 119 | Цылістыян Цеханоўскі | 32 | Вольнапрактыкуючы лекар г. Горадні | Па падазрэнні, што быў тайным агентам Цэнтральнага камітэта ў Горадні і павеце; з 5 ліпеня 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 120 | Станіслаў Сільвестровіч | 30 | Памешчык Гарадзенскага пав. | Па падазрэнні, што быў тайным агентам Цэнтральнага камітэта ў Горадні і павеце; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 121 | Сігізмунд Урублеўскі | 19 | Былы студэнт Кіеўскага ўніверсітэта | Па падазрэнні, што быў тайным агентам Цэнтральнага камітэта ў Горадні і павеце; з 5 ліпеня 1863 г. |
| 122 | Фелікс Шумкоўскі | 75 | Памешчык Беластоцкага пав. | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 123 | Алаізы Шумкоўскі | 41 | Сын Ф. Шумкоўскага | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 124 | Антон Міневіч | 45 | Дваранін Беластоцкага пав. | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 125 | Мацвей Дзюбінскі | 47 | Арганіст, селянін Беластоцкага пав. | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 126 | Іван Радомскі | 30 | Шляхціц Беластоцкага пав. | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 127 | Іван Якавец | 23 | Селянін Беластоцкага пав. | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 128 | Францішка Цераскоўна | 30 | Удава адстаўнога салдата | За дастаўку харчавання паўстанцам; з 8 жніўня 1863 г. |
| 129 | Аляксей Чаглакоў | 32 | Былы станавы прыстаў | За неданясенне пра знаходжанне «шайки» паводле паказанняў сялянаў |
| 130 | Леапольд Валіцкі | 50 | Памешчык Гарадзенскага пав. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 131 | Юзаф Шмігер | 57 | Аканом памешчыка Валіцкага, дваранін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 132 | Юзаф Юнг | 50 | Упраўляючы памешчыка Валіцкага, дваранін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 133 | Іван Станішэўскі | 42 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 134 | Іван Пуховіч | 28 | Аднадворац Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 135 | Схаластыка Германовічуўна | 39 | Дачка ўніяцкага святара | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 136 | Леакадзія Германовічуўна | 30 | Дачка ўніяцкага святара | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 137 | Камелія Германовічуўна | 28 | Дачка ўніяцкага святара | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 138 | Данат Ванароўскі | 46 | Ляснік мястэчка Езеры (суч. Азёры) | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 139 | Аляксандр Міхайлоўскі | 52 | Селянін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 6 жніўня 1863 г. |
| 140 | Дамінік Раманоўскі | 47 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 12 жніўня 1863 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 141 | Пелагея Рamanoўская | 15 | Дачка Д. Раманоўскага | За садзейнічанне паўстанню; з 12 жніўня 1863 г. |
| 142 | Юлія Нажымская | 32 | Дваранка Гарадзенскай губ. | За садзейнічанне паўстанню; з 12 жніўня 1863 г. |
| 143 | Ульян Аблашэвіч | 25 | Селянін Гарадзенскага пав. | За знаходжанне ў «шайке»; з 15 жніўня 1863 г. |
| 144 | Венядзікт Забела | 59 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За нясвоечасовае данясенне пра тое, што паўстанцы бралі харчаванне ў памешчыка Незабітоўскага; з 25 жніўня 1863 г. |
| 145 | Сцяпан Свянціцкі | 43 | «Вольный человек» Мінскай губ. | За нясвоечасовае данясенне пра тое, што паўстанцы бралі харчаванне ў памешчыка Незабітоўскага; з 25 жніўня 1863 г. |
| 146 | Павел Крупель | 33 | Шляхціц Гарадзенскай губ. | За нясвоечасовае данясенне пра тое, што паўстанцы бралі харчаванне ў памешчыка Незабітоўскага; з 25 жніўня 1863 г. |
| 147 | Іосіф Сурконт | 27 | Шляхціц Лідскага пав. Віленскай губ. | За нясвоечасовае данясенне пра тое, што паўстанцы бралі харчаванне ў памешчыка Незабітоўскага; з 25 жніўня 1863 г. |
| 148 | Карл Палуяноўскі | 38 | Дваранін Гарадзенскай губ. | За нясвоечасовае данясенне пра тое, што паўстанцы бралі харчаванне ў памешчыка Незабітоўскага; з 25 жніўня 1863 г. |

pawet.net